# Гарацъ агні Салігорска

...ВЕЧАРАМ мы пад'язджалі да горада шахцёраў. Самога Салігорска яшчэ не было відаць, а ў цёмным небе ўдалечыні ўжо замільгацелі чырвоныя зоркі. Яны гарэлі над капрамі шахты, нібы сведчачы аб тым, што дзесьці глыбока пад зямлёй кіпіць напружаная работа.

Яшчэ некалькі кіламетраў па выдатнай асфальтаванай дарозе і на гарызонце раптоўна ўзнік россып электрычных агнёў. Па пункцірах свецячыхся кропак угадваліся шматпавярховыя карпусы, роўныя лініі вуліц, кварталаў.

Так, гэта сапраўдны горад! У гэтым мы пераканаліся, калі раніцай выйшлі з гасцініцы і апынуліся сярод гмахаў дамоў. Чатырохпавярховыя, з белай сілікатнай цэглы. Вакол іх — маладыя дрэўцы, газоны, кветнікі. І што кідаецца ў вочы — мноства дзетвары. Карапузы корпаюцца ў пясочніцах, іх звонкія галасы чуваць на кожным кроку. Вось яркая прыкмета таго, што навасельцы адчуваюць сябе тут пастаяннымі жыхарамі, што для іх Салігорск сапраўды стаў родным горадам.

*Характэрны штрых:* за 9 месяцаў гэтага года салігорцы справілі каля 100 вяселляў, зарэгістравалі нараджэнне 225 дзяцей.

І яшчэ некалькі красамоўных лічбаў. У 1960 годзе ў пасёлку шахцёраў налічвалася 3 тысячы жыхароў, у мінулым — 7, а цяпер — 13 тысяч насельніцтва. 18 чатырохпавярховых шматкватэрных дамоў, 15 катэджаў па 4—8 кватэр кожны, 300 адна- двухкватэрных дамоў. Гэта — не лічачы раёна індывідуальнай забудовы. Вось які сёння шахцёрскі горад!

Але не толькі выдатным жыллём багаты Салігорск. Два цудоўныя універмагі, шырокаэкранны кінатэатр, некалькі сталовых, кафэ, клуб, горнахімічны тэхнікум, 2 сярэднія школы, бальніца, дзіцячыя сады і яслі, музычная школа — будынкі гэтых і многіх іншых культурна-бытавых устаноў упрыгожваюць горад, робяць яго добраўпарадкаваным, зручным для жыцця.

А больш за ўсё ўпрыгожваюць юны Салігорск яго жыхары — шахцёры, будаўнікі, інжынеры — людзі многіх спецыяльнасцей, якія прыехалі сюды з усіх куткоў краіны. Надыдзе час, і пра іх напішуць аповесці, ім будуць прысвечаны кінафільмы. Давайце пазнаёмімся з некаторымі з іх.

...Па шахтаваму ствалу клецъ імкліва ляціць уніз. Праходзіць мінута, і яе падзенне плаўна сціхае. У вочы б'е яркае святло электралямп. Руднічны двор. Сюды па транспарцёрах сцякаецца здабыты гарнякамі сільвініт. Па прасторнаму штрэку, прасечанаму ў пародзе, рухаемся насустрач патоку солі, туды, дзе працуюць горнапраходчыя камбайны — выдатныя механізмы, якія прыйшлі на змену гарняцкаму адбойнаму малатку.

Глуха з глыбінь зямлі даносіцца гул. Ён усё гучней і гучней. Вось і ачышчальная камера, у якой вядзе здабычу калійнай солі брыгада камбайна Барыса Жалязінскага. Лёс гэтага маладога шахцёра характэрны для многіх салігорскіх гарнякоў.

Не думаў і не меркаваў хлопец з Рэчыцы працаваць пад зямлёй, яго вабілі водныя прасторы, і ён стаў навучэнцам Гомельскага рамеснага вучылішча рачнікоў. Затым вайна, ваеннае вучылішча, баі, паходы. Два ордэны, чатыры медалі — знакі заслуг перад Радзімай. Настаў мір. Капітан Барыс Жалязінскі — камандзір роты, кадравы афіцэр Савецкай Арміі. А ў 1960 годзе дывізія была расфарміравана і афіцэр стаў цывільным чалавекам.

Вось тады Жалязінскі і прыехаў у Салігорск авалодваць новай прафесіяй. Вучыўся ўпорна, настойліва, па-армейску. Мінулі тры месяцы —стаў памочнікам машыніста камбайна, а з пачатку гэтага года — машыністам. Цяпер пра яго ўжо гавораць як аб адным з лепшых машыністаў. Норма праходкі пароды 9 метраў на камбайн за змену, а Жалязінскі дае 11—12. А кожны пагонны метр — гэта 13 кубаметраў солі! Шахцёры ўмеюць цаніць добрых таварышаў, працавітых людзей. Камуністы рудніка аднагалосна выбралі Жалязінскага сваім важаком.

Ідзе на рудніку слава і аб другім шахцёру — Леаніду Булгаку, таксама машыністу камбайна. Экіпаж, які ён узначальвае, на месяц апярэджвае графік здабычы ўгнаенняў. Шахцёр высока трымае гонар народнага выбранніка — ён жа дэпутат Вярхоўнага Савета СССР.

А за некалькі кіламетраў поўным ходам ужо разгортваецца будаўніцтва другога калійнага камбіната. Запасы солей такія, што работы на многія дзесяцігоддзі хопіць для некалькіх камбінатаў.

Мацнее, мужнее гарняцкі горад, расце калектыў шахцёраў і добрая слава аб іх разносіцца ўсё далей і далей.

Мік. ВЕРАС.

«БУДАЎНІК КАМУНІЗМА»
2 стар. 11 кастрычніка 1962 г.